ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУА______Г.У.Шугала
30.08.2016

# Функцыянальныя абавязкі кіраўніка метадычнага фарміравання

Кіраўнік метадычнага фарміравання прызначаецца загадам дырэктара ўстановы адукацыі з ліку настаўнікаў вышэйшай і першай кваліфікацыйнай катэгорыі. Матэрыяльнае стымуляванне кіраўніка метадычнага фарміравання ажыццяўляецца за кошт прэміяльнага фонду ўстановы адукацыі.

Змест дзейнасці кіраўніка метадычнага фарміравання:

1. Аналізуе работу за мінулы навучальны год і ажыццяўляе планаванне работы на наступны.
2. Арганізуе пасяджэнні метадычнага фарміравання.
3. Арганізуе прафесійнае ўзаемадзеянне, у тым ліку ўзаеманаведванне і абмеркаванне адкрытых заняткаў калегаў.
4. Вядзе дакументацыю метадычнага фарміравання, забяспечвае яе якаснае афармленне (пратаколы пасяджэнняў, матэрыялы выступаючых).
5. Распрацоўвае метадычныя рэкамендацыі па тэме пасяджэнняў метадычнага фарміравання.
6. Прымае ўдзел у падрыхтоўцы, арганізацыі і правядзенні прадметных конкурсаў, метадычных мерапрыемстваў.
7. Сістэматычна вывучае нарматыўную прававую базу, сочыць за навінкамі спецыяльнай і педагагічнай літаратуры, своечасова знаёміць з імі настаўнікаў.
8. Складае і сістэматызуе банк даных: тэстаў, дыягностыкі, паўрочных распрацовак, раздатачнага матэрыялу, інавацыйных тэхналогій і г.д.
9. Ажыццяўляе арганізацыю прафесійнай падтрымкі і бягучага кансультавання педагогаў.
10. Знаёміцца з работай калегаў, якія прыбылі ва ўстанову, узроўнем іх прафесійнай кваліфікацыі.
11. Аказвае дапамогу маладым і малавопытным калегам у распрацоўцы каляндарна-тэматычнага планавання, асобных навучальных тым, урокаў.
12. Стварае банк даных эфектыўнага педагагічнага вопыту калег.
13. Аказвае дапамогу куратару прадметнай вобласці ў зборы неабходных матэрыялаў па абагульненню вопыту работы педагогаў.
14. Ажыццяўляе арганізацыйна-метадычнае суправаджэнне працэсу асваення педагогамі сучасных адукацыйных тэхналогій, рэалізацыі інавацыйных праектаў, даследча - эксперыментальнай работы.